**Ячмянёва І.М. (Магілёў)**

# ЛЕКСІЧНЫЯ АРХАІЗМЫ Ў ВЯСЕЛЬНЫХ ПЕСНЯХ

Архаізмы (ад грэч. archaios - старадаўні, устарэлы) - даўнейшыя назвы, якія ў працэсе развіцця мовы былі заменены новымі словамі-сінонімамі. Інакш кажучы, гэта ўстарэлыя назвы сучасных рэчаў і з'яў. У залежнасці ад таго, ці ўстарэла ўсё слова цалкам, або ўстарэлай з'яўляецца толькі фанетычная абалонка слова, або толькі нейкае з яго значэнняў, даследчыкі падзяляюць архаізмы на лексічныя і семантычныя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.

Вучоныя даўно звярнулі ўвагу на існаванне архаізмаў у мове фальклору. Найбольш распаўсюджаным і агульнапрынятым было меркаванне, якое сцвярджала існаванне архаізмаў у мове фальклору імкненнем народа да дакладнага, без змен, запамінання і ўзнаўлення фальклорных тэкстаў пры перадачы іх з вуснаў у вусны, з пакалення ў пакаленне. У апошні час вучоныя А.Яўгеньева і І.Асавецкі далі новае тлумачэнне гэтай з'явы. Яны адзначылі, што захаванне моўных архаізмаў у паэзіі садзейнічае выкарыстоўванню іх у якасці аднаго з элементаў сістэмы паэтычных сродкаў фальклору.

У мове вясельных песень заўважаецца шырокае выкарыстанне архаічных элементаў, якое надае твору ўрачыстае, высокае гучанне. Сярод лексічных архаізмаў сустракаюцца: 1) уласналексічныя - словы, якія поўнасцю ўстарэлі і выцеснены іншымі словамі, з іншым коранем.

Шчасце - долю прынясі,
Шчаслівую гадзіну
Нашаму сужаньку-чалядзіну.[1]
(т. 2. С. 68)

Маладога сястрыцы
Пад караваем скакалі
З квятамі, з касіцамі
З чорнымі ачыцамі.
(т. 2. С. 155).

2) лексіка-фанетычныя архаізмы - словы, у якіх у працэсе гістарычнага развіцця мовы некалькі відазмянілася іх гукавая форма, яны звычайна адрозніваюцца ад адпаведных ім сучасных слоў адным-двума гукамі. Разнавіднасцю лексіка-фанетычных архаізмаў з'яўляюцца акцэнталагічныя архаізмы, у якіх устарэлым з'яўляецца толькі націск.

Ідзьце, сваццi, да Крукава,
А з Крукава да Львова
Па тыя малярчыкі
Што харашо малююць,
Золатам гафтуюць.
(т. 2. С. 148)

Цяром рубяць пад акном,
Каравай гіблюць за сталом.
Каля цярома трасочкі,
Каля караваю дзявочкі.
(т. 2. С. 81).

3) лексіка-марфалагічныя архаізмы - устарэлыя формы слоў, якія існуюць на фоне адпаведных сучасных форм (ціша на фоне сучаснага ціш н.ск., адз. л., будучы час рабіцьмуць - суч. будуць рабіць; дзеясловы на ці, форм клічнага склону, якія надаюць адценне ўрачыстасці, павагі, пачцівасці, сяброўскай спагадлівасці, ласкі і інш.

- Караваю, караваю, хто цябе нарадзіў?
Нарадзіла мяне пані каралева
Ручкі бяленькімі, перснямі залаценькімі.
(т. 2. С. 149)

Ой, дайце нам свечкі,
Пайдземо да рэчкі
Памяла мачыцы
Каравай садзіці.
(т. 2. С. 77).

[1] БНТ. Вяселле. Песні: У 6-ці кн. - Мн., 1981, т. 2.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як відаць, архаічныя моўныя з'явы шырока выкарыстоўваюцца ў песні як сродак паэтыкі. Аб тым, што выкарыстанне адзначаных моўных архаізмаў у якасці паэтычнага сродка з'яўляецца сапраўднай прычынай іх ужывання ў вясельных песнях, гаворыць той факт, што песня захавала толькі тыя архаічныя моўныя з'явы, якія адказваюць патрабаванням выкарыстоўвання іх як паэтычнага сродка, і, наадварот, страціла тыя моўныя архаізмы, якія не адпавядалі іх ужыванню ў вышэй адзначаных мэтах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова